*М.А.БЯСПАЛАЯ*

# ПРАБЛЕМНЫЯ ПЫТАННІ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ Ў НАВУКОВЫХ ДАСЛЕДАВАННЯХ МУЗЕЯЎ

*Разглядаецца працэс навуковага асэнсавання некаторых падзей Вялікай Айчыннай вайны, паказваецца, як выкарыстоўваліся музейныя сродкі для перадачы памяці аб ёй будучым пакаленням з улікам сацыяльна-культурных умоў пэўнага гістарычнага перыяду.*

Неабходнасць захавання гістарычнай памяці аб падзеях Вялікай Айчыннай вайны многім, хто меў да гэтага дачыненне, стала зразумела яшчэ падчас ваенных дзеянняў. Кіруючыя органы пачалі прымаць дырэктывы аб зборы матэрыялаў, якія датычыліся падзей вайны, ужо ў лістападзе 1941 г., у самы напружаны момант баёў на подступах да Масквы. Аднак, як канстатавалі сучаснікі, у большасці выпадкаў працэс "збірання матэрыялаў па Вялікай Айчыннай вайне адбываўся ў асноўным незалежна ад рэгламентуючых дакументаў" [6, с. 248].

У гады вайны прадаўжаў сваю дзейнасць Навукова-даследчы інстытут краязнаўчай і музейнай работы. Аднак Наркамат асветы выказваў незадавальненне аслабленнем навукова-даследчай работы інстытута, якая абмяжоўвалася перасоўнымі выставамі па ваеннай тэматыцы. Дырэктыўным пісьмом ад 26 студзеня 1942 г. інстытуту вызначаліся наступныя задачы: аднавіць поўную карціну культурных і музейных каштоўнасцей, якія знаходзіліся на толькі што вызваленых тэрыторыях, апісаць разбураныя помнікі, разрабаваныя музеі і музейныя каштоўнасці, а таксама прыняць удзел у стварэнні навуковага зводнага каталога музейных каштоўнасцей [6, с. 249].

Акрамя адзначаных кірункаў, у буйных музеях гістарычнага профілю адбываўся працэс навуковага асэнсавання тагачасных ваенных падзей. Да прыкладу, на працягу 1943 г. на пасяджэннях вучонага савета Дзяржаўнага гістарычнага музея (ДзГМ) у Маскве былі абмеркаваны пытанні афармлення выставы "Разгром нямецка-фашысцкіх войск на подступах да Масквы", а таксама прааналізаваны вопыт масавай палітасветработы музея ва ўмовах вайны [6, с. 245]. На працягу 1943 г. музеем распрацоўваліся навукова-даследчыя тэмы "Дакументы партызанскага руху ў Беларусі за першыя месяцы вайны па архіўных матэрыялах выставы ў ДзГМ" і "Партызанскі рух у Беларусі за першыя месяцы вайны паводле зводак Саўінфармбюро". Гэтыя тэмы прадаўжалі асвятленне падзей, распачатае выставай пад назвай "Беларусія жыве, Беларусія змагаецца, Беларусія была і будзе савецкай", якая была падрыхтавана на падставе дакументаў і матэрыялаў, прадстаўленых Камісіяй па зборы дакументаў і матэрыялаў Вялікай Айчыннай вайны, створанай рашэннем ЦК КП(б)Б 2 чэрвеня 1942 г. Пачатак яе дзейнасці прыпадаў на перыяд існавання т. зв. Віцебскіх, ці Суражскіх, варот – 40-кіламетровага прарыву лініі фронту, праз які на працягу 10 месяцаў ажыццяўлялася сувязь з акупіраванымі раёнамі рэспублікі. Пад кіраўніцтвам камісіі пачаўся шырокі і актыўны рух па зборы ваенных, перш за ўсё партызанскіх, рэліквій. Гэтая праца прадаўжалася і пасля ліквідацыі варот пры ўстанаўленні рэгулярнай паветранай сувязі акупіраваных раёнаў з Масквой. Супрацоўнікі камісіі сустракалі кожны самалёт непасрэдна на лётным полі. Праз паўгода з пачатку дзейнасці камісіі першыя 313 экспанатаў і былі паказаны на выставе "Беларусія жыве, Беларусія змагаецца, Беларусія была і будзе савецкай", якая адкрылася ў памяшканні ДзГМ у Маскве [3, с. 6–7].

Дарэчы, нагадаем, што ў гэтым жа 1942 г. кіраўніцтва нацысцкай Германіі таксама планавала адкрыць музей зняволеных народаў, быў нават выдадзены адпаведны загад і распрацаваны праект будынка будучага музея, аднак падзеі на савецка-германскім фронце парушылі планы нацыстаў.

Арганізацыя гэтай выставы восенню 1942 г. стала першым крокам у наданні партызанскаму руху належнага значэння і падштурхнула кіраўніцтва БССР да прыняцця 30 верасня 1943 г. пастановы "Аб стварэнні музея па гісторыі барацьбы беларускага народа з нямецка-фашысцкімі акупантамі ў Вялікую Айчынную вайну" на базе названай выставы. Праз два тыдні пасля вызвалення Мінска ў штат Беларускага дзяржаўнага музея

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

гісторыі Вялікай Айчыннай вайны былі прыняты першыя навуковыя супрацоўнікі, а 26 жніўня 1944 г. з ДзГМ была прывезена выстава 1942 г., аб якой гаварылася вышэй і якая па гэты час працавала ў Маскве.

Першыя супрацоўнікі музея – у асноўным былыя партызаны і франтавікі. Сярод іх можна назваць будучага рэктара БДУ члена-карэспандэнта, доктара гістарычных навук, прафесара У.М.Сікорскага, будучага дэкана гістарычнага факультэта БДУ кандыдата гістарычных навук, дацэнта П.З.Савачкіна, якія прымалі самы актыўны ўдзел у розных пошуковых экспедыцыях. Напрыклад, у ліпені–жніўні 1944 г. музейныя супрацоўнікі ўдзельнічалі ў рабоце Надзвычайнай камісіі па расследаванні злачынстваў, якія былі здзейснены акупантамі ў раёне вёскі Малы Трасцянец – месцы масавага знішчэння людзей. У верасні 1944 г. і ў лютым 1945 г. супрацоўнікі музея збіралі матэрыялы ў воінскіх падраздзяленнях 1-га Беларускага фронту, а ў маі 1945 г. яны працавалі два месяцы ў Берліне. Пасля заканчэння вайны ў 1949 г. супрацоўнікі музея прымалі ўдзел у першых раскопках на тэрыторыі Брэсцкай крэпасці, у пачатку 1950-х гг. на месцы прыгранічных баёў праводзілі пошукавыя экспедыцыі ва ўсіх раёнах рэспублікі.

Ужо перад адкрыццём першай экспазіцыі музея 22 кастрычніка 1944 г. у яго фондах налічвалася больш за 10 тыс. экспанатаў, а сёння – больш за 141 тыс. [3, с. 8–9]. Такім чынам, відавочна, што фонды музея пачалі фарміравацца падчас вайны шляхам усенароднай падтрымкі і актыўнага ўдзелу ўсіх, хто меў дачыненне да ваенных падзей. Гэта адзін з нешматлікіх прыкладаў у гісторыі, калі працэс музеефікацыі адбываўся ў той жа час, калі адбываліся і падзеі. Перад супрацоўнікамі музея стаяла задача навукова апрацаваць матэрыяльную народную памяць аб вайне, музейнымі сродкамі перадаць яе ў спадчыну будучым пакаленням.

Працэс навуковай апрацоўкі і музеефікацыі прадметаў, якія захоўваліся ў фондах і колькасць якіх пастаянна ўзрастала, патрабаваў глыбокіх спецыяльных ведаў і высокага агульнага ўзроўню. Не ўсе супрацоўнікі музея адпавядалі такім патрабаванням, інакш не сустракаліся б у першых экскурсійных і экспазіцыйных тэкстах такія радкі (прыводзяцца згодна арыгіналу): “Вооруженные оружием практического действия – директивой ЦК КП(б)Б…”, “Имели место и многочисленные факты героической, политической самодеятельности со стороны коммунистов, которые, в силу целого ряда обстоятельств, очутились на оккупированной немцами территории Белоруссии… стали самолично искать путь и средства для борьбы против оккупантов…”, “Такой же трудный и сложный путь, так сказать эмбрионального развития, совершали и те коммунисты, которые попали в немецкое окружение…”, “Бесстрашной славой покрыли себя бойцы…”, “Но такого величавого счастья победы…”, “Вечно будет памятно имя Героя Советского Союза К.С.Заслонова, который боролся и погиб богатырской смертью за счастье советского народа…”, “Искусно маневрируя и громя врага оттуда – откуда их никто не ждал, заслоновцы исчезали, как дым, когда этого требовала обстановка” і г. д. [1, л. 20–21].

У снежні 1947 г. усе кірункі работы музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны правярала камісія Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КП(б)Б. У даведцы падкрэсліваліся выпадковы падбор навуковых супрацоўнікаў і адсутнасць плана навукова-даследчай работы, які з’явіўся толькі ў другой палове 1947 г., але па розных прычынах аказаўся не выкананы, за выключэннем дзвюх навуковых тэм, адну з іх “Аграрная палітыка нямецкіх акупантаў на тэрыторыі Беларусі” даследаваў П.З.Савачкін [1, л. 14]. На думку камісіі, галоўны недахоп навукова-даследчай дзейнасці – неглыбокае навуковае асэнсаванне экспазіцыйнай работы. Адлюстраваннем гэтага камісія палічыла адсутнасць у экспазіцыі матэрыялаў па баявых аперацыях асобных брыгад і атрадаў у сістэме партызанскага медыцынскага абслугоўвання і інш. [1, л. 10]. Камісія звяртала ўвагу і на факты няправільнага выкарыстання дзяржаўных сродкаў, якія налічваліся авансам нават за выкананне планавай навуковай работы супрацоўнікаў.

Наступныя дзесяцігоддзі, маючца на ўвазе 1960–1980-я гг., былі насычаны актыўнай навукова-даследчай работай. Перш за ўсё яна была звязана з працэсам пошуку невядомых фактаў абароны Брэсцкай крэпасці. Але і ў астатніх гістарычных музеях прадаўжалася пошукавая работа, якая дапамагала раскрыць і дапоўніць змест многіх эпізодаў вайны. Размова можа ісці аб пошуку, аналізе, распаўсюджванні і ўжыванні новых навуковых фактаў толькі па асобных аспектах вайны. Даследаванні мелі прыкладны характар, таму

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

што іх асноўная мэта заключалася ў тым, каб паказаць магчымасць выкарыстання атрыманых даных у экспазіцыі.

Чым далей ад ваеннага ліхалецця, тым больш выразна праяўляюцца недастатковасць і запалітызаванасць уяўленняў аб паўсядзённым жыцці людзей на акупіраванай тэрыторыі, у партызанскіх атрадах, падполлі і г. д. На наш погляд, менавіта музейныя супрацоўнікі, карыстаючыся фондамі і шматлікімі сувязямі з ветэранамі вайны і іх сем'ямі, у стане дапамагчы пасляваенным пакаленням набыць рэальнае ўяўленне аб жыцці ў ваенных умовах.

У 1960–1980-я гг. з'яўляюцца шматлікія публікацыі навуковых супрацоўнікаў музеяў у энцыклапедыях, навуковых зборніках, перыядычным друку. Найбольш актыўна распрацоўваліся пытанні зараджэння і развіцця партызанскага і падпольнага руху, абароны Брэсцкай крэпасці, акупацыйнага рэжыму, вызвалення Беларусі. Адно з найбольш з лепшых выданняў гэтага перыяду – невялікая брашура "Экскурсія ў Трасцянец", якая на падставе малавядомых дакументальных матэрыялаў раскрывае працэс масавага знішчэння людзей у чацвёртым па велічыні лагеры смерці [2].

Аднак, нягледзячы на неаглядную колькасць даследаванняў аб Вялікай Айчыннай вайне, шматлікія праблемныя пытанні яе заставаліся некранутымі. Сацыяльна-эканамічная і сацыяльна-культурная сітуацыя, існуючая да канца 80-х гг. мінулага стагоддзя, не абвастрала некаторыя праблемныя пытанні вайны, але ў 90-я гг. яны выйшлі на першае месца і аб многіх з іх ужо нельга было гаварыць па ранейшых трафарэтных уяўленнях.

Для навуковых супрацоўнікаў гістарычных музеяў ваеннага профілю настаў перыяд актыўнай навуковай дзейнасці. З'яўляюцца цікавыя артыкулы па самай разнастайнай тэматыцы, напрыклад "Ваенныя грошы Другой сусветнай вайны ў музейнай калекцыі баністыкі", "Гісторыя Першага і Другога Беларускіх драматычных тэатраў у дакументах музейных фондаў", "Дзіцячыя дамы Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны", "Генералы 1941 года" і інш.

Навуковымі супрацоўнікамі музея Вялікай Айчыннай вайны была падрабязна даследавана і дакументальна адлюстравана сітуацыя, якая склалася ў Мінску ў першыя дні вайны. Звесткі аб гэтых падзеях адсутнічалі і ў прафесійных навуковых даследаваннях і ў падручніках. Нагадаем толькі адзін з эпізодаў, мабыць, самы выразны і вобразны. 16 чэрвеня 1941 г. на гастролі ў Мінск прыбыла трупа МХАТ у складзе 117 чалавек. Сярод акцёраў былі народныя артысты СССР В.І.Качалаў, І.М.Масквін, Б.Р.Дабранраваў і інш. Трупа прывезла спектаклі "На дне", "Дні Турбіных", "Тарцюф" і "Школа зласлоўя". Гастролі адкрыліся 17 чэрвеня спектаклем "На дне". Вечарам 21 чэрвеня 1941 г. быў дадзены спектакль "Тарцюф", на якім прысутнічалі кіраўніцтва рэспублікі на чале з першым сакратаром ЦК КП(б)Б П.К.Панамарэнкам і камандаванне Заходняй ваеннай акругі на чале з генералам арміі Д.Р.Паўлавым.

На 22 чэрвеня былі запланаваны спектаклі МХАТ у воінскіх падраздзяленнях, на радыё і ў тэатры. У поўдзень 22 чэрвеня пры поўнай зале пачаўся спектакль "Школа зласлоўя", артысты і гледачы не чулі выступленне В.М.Молатава. Калі аб'явілі трывогу, толькі некаторыя гледачы пакінулі залу. Днем прайшоў запланаваны шэфскі канцэрт для салдат, а вечарам у паўпустой зале ставілі спектакль "На дне".

23 чэрвеня ў Мінску ўжо было трывожна, папаўзлі розныя чуткі. Кіраўнік трупы І.М.Масквін на свой запыт: "Што рабіць?" – атрымаў ад дырэктара тэатра з Масквы адказ: "Прадаўжаць гастролі". Арганізатары гастролей, выконваючы ўказанні ўлад не паддавацца паніцы, заклікалі артыстаў не садзейнічаць сваім тэрміновым ад'ездам распаўсюджванню панікі. У выніку мхатаўцы зноў выйшлі на сцэну вечарам 23 чэрвеня ў спектаклі "Школа зласлоўя". У тэатральнай зале на паўтары тысячы месцаў сядзелі 70–80 маладых людзей. Падчас налёту нямецкай авіяцыі раніцай 24 чэрвеня загінулі дэкарацыі і касцюмы трупы коштам 1,5 млн руб.  А вечарам у гэты ж дзень частка трупы, у асноўным жанчыны, выехалі з Мінска, а ноччу астатнія мхатаўцы пачалі прабірацца на Усход [5, с. 75–78].

Безумоўна, усебаковае асэнсаванне падзей любой вайны немагчыма без уліку супрацьлеглай пазіцыі, у нашым выпадку – нямецкай. У 1990-я гг. пачалі паступаць ад германскага боку матэрыялы, якія адлюстроўвалі злачынствы вермахта і акупацыйных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

улад у Беларусі. Дарэчы, навуковая думка Германіі таксама знаходзіцца ў стане навуковага асэнсавання такіх праблем, як, напрыклад, нацысцкая акупацыя Беларусі, характарыстыка вермахта як аднаго з галоўных выканаўцаў жахлівых злачынстваў і інш. Яны актыўна абмяркоўваліся і прадаўжаюць абмяркоўвацца ў нямецкім грамадстве, асабліва паводзіны вермахта на акупіраванай тэрыторыі. Найноўшая германская гістарыяграфія разглядае акупацыйную палітыку нацысцкай Германіі як самае "вялікае злачынства ў гісторыі нацысцкага панавання над Еўропай" [7, с. 115].

Складана ўявіць, што два дзесяцігоддзі назад не магла нават узнікнуць думка аб пісьмах нямецкіх салдат і пісьмах да іх як аб гістарычных крыніцах і як аб каштоўных музейных калекцыях. Аднак іх аналіз паказаў, што яны ўтрымліваюць вельмі багатую інфармацыю. Напрыклад, у пісьмах апошніх месяцаў вайны, як у люстэрку, адбіліся пачуцці нямецкіх жанчын. Напрыклад: "Я кожны дзень з заміраннем сэрца слухаю паведамленні аб вермахце. Даводзіцца канстатаваць, што рускія крок за крокам наблі-жаюцца да нашага любімага горада. Але я ўсё ж думаю, што Іван не дачакаецца таго цудоўнага дня, калі ён увойдзе ў Берлін…" [4, с. 62].

Навуковыя даследаванні супрацоўнікаў музеяў ахопліваюць усё новыя фондавыя калекцыі, многія з якіх з'яўляюцца унікальнай гістарычнай крыніцай. Самыя цікавыя калекцыі адносяцца да гісторыі партызанскага руху. Такога размаху партызанская барацьба не атрымала на іншых акупіраваных тэрыторыях і такіх калекцый не мае ні адзін музей. Як прыклад можна прывесці калекцыю рукапісных партызанскіх часопісаў, якая налічвае 248 адзінак, прычым усе нумары існуюць у адзіным экзэмпляры. Не так даўно гэтая калекцыя прызнана гісторыка-культурнай каштоўнасцю першай катэгорыі і ўключана ў Дзяржаўны спіс. Старонкі рукапісных часопісаў утрымліваюць самую разнастайную інфармацыю, якая па гарачых слядах раскрывае баявое і паўсядзённае жыццё партызан. Многія факты з гэтых часопісаў увайшлі ў кандыдацкія дысертацыі, а Р.Ф.Шаура цэлы раздзел доктарскай дысертацыі прысвяціў аналізу інсітнага мастацтва партызан, якое вельмі выразна прасочваецца на старонках часопісаў. Вынікам навукова-даследчай працы над гэтай калекцыяй стала выданне ў 2009 г. вельмі дакладна і тонка прадуманага партызанскага альманаха.

Такім чынам, можна канстатаваць існаванне актыўнай навукова-пошукавай і навукова-даследчай работы ў гістарычных музеях па самых разнастайных праблемах Вялікай Айчыннай вайны. Неабходна адзначыць праяўленне выразна акрэсленых этапаў станаўлення гэтага кірунку дзейнасці музеяў, якія супадалі з пэўнымі перыядамі сацыяльна-культурнага развіцця грамадства. Безумоўна, адметнасцю навукова-даследчай дзейнасці музеяў з'яўляецца яе практычнае значэнне.

1. *Архіў* Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, інв. № 187.

2. *Ванькович, А.Г.* Экскурсия в Тростенец / А.Г.Ванькович. – Мн.: Полымя, 1987. – 2-е изд., исправл. – 31 с.

3. *Воронкова, И.Ю.* Белорусский государственный музей истории Великой Отечественной войны – хранилище памяти народной / И.Ю.Воронкова // Вызваленне Беларусі ад германскіх акупантаў (восень 1943 – лета 1944 г.): матэрыялы рэсп. навук.-тэарэт. канф. (Мінск, 29 крас. 2004 г.). – Мн.: Бел. гос. пед. ун-т, 2004. – С. 5–9.

4. *Воронкова, И.Ю.* Письма солдатам вермахта (обзор коллекции Белорусского государственного музея истории Великой Отечественной войны) / И.Ю.Воронкова // Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць: матэрыялы Міжнар. навук. канф. (Мінск, 16 мая 2003 г.). – Мн.: Мінскі дзярж. лінгв. ун-т, 2003. – Вып. 2. – С. 54–65.

5. *Воронкова, И.Ю.* Прерванные гастроли. Московский художественный театр в Минске в июне 1941 года / И.Ю.Воронкова // Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць: матэрыялы Міжнар. навук. канф. (Мінск, 12 мая 2006 г.). – Мн.: Мінскі дзярж. лінгв. ун-т, 2007. – С. 74–80.

6. *Издания* Научно-исследовательского института краеведческой и музейной работы в годы войны // Труды Научно-исследовательского института музееведения. – М., 1961. – Вып. 2. – С. 245–248.

7. *Новікаў, С.Я.* Вялікая Айчынная вайна і акупацыя Беларусі (1941–1944 гг.): падыходы беларускіх і германскіх даследчыкаў / С.Я.Новікаў // Трагічнае лета 1941:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

напамін гісторыі: матэрыялы Міжнар. навук.-тэарэт. канф. (Мінск, 22 чэрвеня 2001 г.). – Мн.: Мінскі дзярж. лінгв. ун-т, 2001. – С. 114–121.

*M.BESPALAYA*

**PROBLEM QUESTIONS OF THE HISTORY OF THE GREAT PATRIOTIC WAR IN THE SCIENTIFIC MUSEUM RESEARCHES**

The process of a scientific interpretation of some events of the Great Patriotic War is considered. The way of the museum means' usage for the transmission of the memory about the War to the future generations, subject to the social and cultural conditions of a particular historical period, is shown.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ